# Сталыпінская аграрная рэформа і яе ажыццяўленне ў Беларусі

## Гісторыя Беларусі, IX клас

**А. А. Дайка,** настаўніца гісторыі Навадворскай базавай школы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці

**Задачы**

1. Расказаць пра асноўныя мерапрыемствы Сталыпінскай аграрнай рэформы, раскрыць іх сутнасць.
2. Стварыць умовы для засваення вучнямі ведаў па тэме.
3. Навучыць выказваць і абараняць свае меркаванні.
4. Падвесці вучняў да разумення амерыканскага шляху развіцця капіталізму і яго адрозненняў ад прускага.
5. Замацаваць уменні даваць гістарычную ацэнку гістарычным дзеячам.
6. Развіваць камунікатыўныя ўменні і навыкі.
7. Развіваць уменні знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі.

**Абсталяванне:** дошка, крэйда, атлас па гісторыі Беларусі для IX класа.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Паняцці:** *хутар, водруб, абшчына, хадок.*

**Персаналі:** П. А. Сталыпін.

**Даты:** 9 лістапада 1906, 1910, 1911 гг.

**Афарызм:** «Дайце мне 20 гадоў, і вы не пазнаеце Расію».

**План урока**

1. Прычыны і мэты аграрнай рэформы.
2. Разбурэнне сялянскай абшчыны.
3. Распаўсюджванне хутарской сістэмы землекарыстання.
4. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі.
5. Увядзенне земстваў.
6. Вынікі рэформаў для Беларусі.

**Ход урока**

*I. Арганізацыйны момант.*

*II. Праверка дамашняга задання: франтальнае апытанне з выкарыстаннем пытанняў падручніка.*

*III. Пераходны момант.*

**Настаўнік.** Успомніце асноўныя палажэнні «Маніфеста аб адмене прыгоннага права». *(Адказы.)*

*IV. Вывучэнне новай тэмы.*

Самастойная работа.

— Запоўніце схему па наступным шаблоне.

Прычыны: існаванне перажыткаў феадалізму:

- цераспалосіца;
- малазямелле сялян;
- памешчыцкае землеўладанне.

— Як вы лічыце, чаму цар пайшоў на рэформу?

**Мэты:** стварыць сельскую буржуазію з сялянскага асяроддзя за кошт другіх сялян; раскалоць сялян; скасаваць абшчыну; перасяліць людзей на незанятыя землі.

— Як вы думаеце, ці разумнае гэта рашэнне? Ці закранае рэформа памешчыкаў?

**Водруб** — адасоблены надзел зямлі, вылучаны з сельскага абшчыннага землекарыстання ў адным месцы замест раней існаваўшай цераспалосіцы.

— Як вы лічыце, што прыдумаў П. А. Сталыпін для тых сялян, у якіх не было ўласнай зямлі? *(Сялянскі пазямельны банк.)*

— Чаму ў падручніку напісана, што для Заходняй Беларусі рэформа не мела сэнсу? *(Адказы.)*

— Прачытайце першы абзац пункта і скажыце, чым адрозніваецца хутар ад водруба? *(Адказы.)*

**Хутар** — адасоблены ўчастак зямлі, які сяляне замацоўвалі ў асабістую ўласнасць і куды пераносілі ўсю сядзібу або частку пабудоў і інвентар.

Вучні працуюць з атласам на с. 126 падручніка.

— З якой часткі Беларусі быў самы высокі выхад на хутары? Які працэнт беларускіх земель быў заняты хутарамі? *(Адказы.)*

— Да 1914 г. з Беларусі па праграме перасялення выехала каля 350 тыс. чалавек, з іх вярнуўся кожны дзясяты. На новых месцах цалкам адсутнічала інфраструктура — не было бальніц, школ, дарог і г. д., не кожны змог прыстасавацца жыць у такіх цяжкіх умовах. Існаваў і другі напрамак эміграцыі беларусаў — краіны Захаду (ЗША, Канада, Германія, Аргенціна, Бразілія). Выязджалі і сяляне, і гараджане (галоўным чынам бегла яўрэйскае насельніцтва ад дзяржаўнага антысемітызму і пагромаў), як на пастаяннае жыхарства, так і на часовыя заробкі. Грошы выкарыстоўвалі на пакупку зямлі і інвентару. Да 1913 г. у замежжа выехалі 1,5 млн чалавек, вярнуліся 600 тыс.

— Успомніце, што такое земствы? Чым яны займаліся? *(Адказы.)*

— Як вы лічыце, чаму ў Заходняй Беларусі не былі ўведзены земствы? *(Адказы.)*

— Ці выканалі сваю мэту рэформы П. А. Сталыпіна? *(Адказы.)*

***V. Замацаванне новага матэрыялу:*** *пытанні і заданні ў канцы падручніка на с. 128.*

***VI. Рэфлексія.***

— Назавіце тры асноўныя мерапрыемствы рэформы. Запоўніце табліцу (вусна).

| Прыкметы для параўнання | Рэформа 1861 г. | Сталыпінская аграрная рэформа |
|---|---|---|
| Мэты | | |
| Сродкі ажыццяўлення | | |
| Вынікі | | |

**Дамашняе заданне:** § 24.

*Дадатак*

## Развіццё капіталізму ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Сталыпінская аграрная рэформа

**1.** Развіццё прамысловасці.

Адбываўся паступовы пераход ад феадальнага да капіталістычнага спосабу вытворчасці. Працэс індустрыялізацыі быў звязаны з прамысловым пераваротам, або прамысловай рэвалюцыяй. Яна пачалася ў Беларусі ў 1830-я гг. і была звязана з:

- узнікненнем першых фабрык;
- паступовым пераходам ад ручной да машыннай працы;



gisdapamoga.bspu.by

• фарміраваннем і колькасным ростам новых вытворчых сіл: прамысловай буржуазіі і фабрычнага пралетарыяту.

Працэс прамысловага развіцця ў Беларусі меў наступныя асаблівасці:

• пад уздзеяннем усерасійскага і еўрапейскага рынкаў канчаткова вызначылася спецыялізацыя беларускай прамысловасці на перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, мінеральнай і лясной сыравіны (кардонна-папяровая, запалкавая, лесахімічная вытворчасць);

• пераважнае размяшчэнне прамысловасці ў сельскай мясцовасці — бліжэй да крыніц сыравіны і таннай рабочай сілы. Большасць фабрык і заводаў размешчаны ў мястэчках і маёнтках. Найбольшае развіццё атрымалі вінакурэнне і дрэваапрацоўка;

• значную частку складала рамесная і мануфактурная дробная вытворчасць: шырока распаўсюджаны прадпрыемствы без паравога рухавіка. На іх працавалі 5—15 рабочых. Найбуйнейшым прадпрыемствам лічылася тытунёвая фабрыка Шарашэўскага ў Гродне — 1445 рабочых;

• даволі нізкі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці. У пачатку XX ст. канцэнтрацыя вытворчасці павялічваецца ў сувязі з пачаткам працэсу аб'яднання капіталаў у форме акцыянерных таварыстваў (прадпрыемстваў, дзе капітал утвараўся з грашовых унёскаў шэрагу прадпрымальнікаў і існаваў у форме акцый, якія свабодна прадаваліся і купляліся) і сіндыкатаў (формы аб'яднання прадпрымальнікаў для рэгулявання аб'ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю):

• запалкавыя фабрыкі ў Пінску, Мазыры, «Маланка» ў Мінску;

• тытунёвая фабрыка «Нёман» у Гродне;

• расійскім і замежным акцыянерным таварыствам належалі льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна», электрычная станцыя і трамвай у Віцебску, папяровая фабрыка ў Шклове.

Развіццё капіталістычнай гаспадаркі, станаўленне таварна-грашовых адносін непасрэдна залежалі ад шляхоў зносін:

• канец XIX ст. — у разліку на 100 км Беларусь мела ў 2 разы больш *шашэйных дарог*, а *рачных* — у 3, чым еўрапейская частка Расіі;

• 1862 г. — першая чыгунка — участак Пецярбургска-Варшаўскай магістралі. Развіццё чыгункі садзейнічала хуткаму развіццю прамысловасці, гандлю, зліццю мясцовых рынкаў Беларусі ў нацыянальны рынак, узмацненню сувязі беларускага рынку з агульнарасійскім і еўрапейскім;

• 1898 г. — Віцебск стаў трэцім горадам Расіі пасля Кіева і Ніжняга Ноўгарада, дзе быў пушчаны гарадскі электрычны трамвай (раней, чым у Маскве і Пецярбургу).

Развіццё прамысловасці і транспарту з'яўлялася асновай росту гарадоў. Аднак беларускія гарады не ператварыліся ў буйныя прамысловыя цэнтры (прамысловасць пераважна размяшчалася ў сельскай мясцовасці). Толькі Мінск і Віцебск мелі ад 50 да 100 тыс. жыхароў.

Цэнтры буйных гарадоў былі забяспечаны водаправодам, каналізацыяй, электрычным асвятленнем, тэлефонам. У гарадах утвараліся новыя плошчы: прывакзальная, тэатральная, адміністрацыйная; разбіваліся скверы, гарадскія сады і паркі.

Працэс урбанізацыі меў у Беларусі свае асаблівасці:

• нягледзячы на двухразовы рост жыхароў у гарадах, іх удзельная вага практычна не змянілася, таму што сельскае насельніцтва расло яшчэ хутчэй;

• к пачатку XX ст. захоўвалася штучная перанаселенасць гарадоў Беларусі яўрэямі, што было звязана з існаваннем мяжы яўрэйскай аседласці.

**2. Развіццё сельскай гаспадаркі. Сталыпінская аграрная рэформа.**

1906 г.— Сталыпінская аграрная рэформа (па прозвішчы ініцыятара — прэм'ер-міністра П. А. Сталыпіна) — «чарговая чыстка зямель для капіталізму».

**Прычыны:** нявырашанасць аграрнага пытання (аб зямлі); існаванне феадальных перажыткаў; рост сялянскага руху (рэвалюцыйнай актыўнасці сялянства).

**Мэты:** забяспечыць паскораныя тэмпы развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы; захаваць дваранска-памешчыцкае землеўладанне; «разбіць» адзіны агульнасялянскі «фронт» супраць

памешчыкаў; паскорыць стварэнне сельскай буржуазіі як апоры самадзяржаўя.

Мерапрыемствы:

• разбурэнне сялянскай абшчыны; замацаванне абшчынных зямельных надзелаў у асабістую ўласнасць сялян; стварэнне водрубаў (выдзяленне селяніну ўчастка зямлі ў адным месцы ўзамен *цераспалосіцы* — палосак зямлі рознай урадлівасці, якія селянін апрацоўваў пры абшчынным землекарыстанні) і хутароў (калі селянін перасяляўся з вёскі на ўчастак, што знаходзіўся за межамі вёскі).

Хутарская гаспадарка нагадвала фермерскую, была арыентавана на рынак. Падворнае землеўладанне ў заходніх раёнах Беларусі (Гродзенская, Мінская, Віленская губерні) паспрыяла замацаванню хутарской гаспадаркі, бо сялянская абшчына тут не існавала. Разбурэнне абшчыны ажыццяўлялася ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, дзе сяляне імкнуліся вызваліцца з-пад залежнасці абшчыны. Для большасці беднякоў і серадннякоў завесці хутарскую гаспадарку было немагчыма з-за адсутнасці недахопу сродкаў;

• добраахвотнае перасяленне малазямельных сялян за Урал, у Сібір, на Далёкі Усход, дзе было шмат неапрацаванай урадлівай глебы з мэтай вырашыць праблему малазямелля. Выдзяляліся беззваротныя грашовыя пазыкі, забяспечваліся спецыяльныя цягнікі, рыхтаваліся пункты прыёму перасяленцаў, наразаліся зямельныя ўчасткі. Аднак каля 10 % ў 1907—1914 гг. сялян вярнуліся назад у сувязі з недастатковай дапамогай з боку ўрада і цяжкімі ўмовамі жыцця.

Асаблівасці Сталыпінскай рэформы ў Беларусі: увядзенне ў 1911 г. земстваў — выбарных органаў мясцовага самакіравання ў трох губернях — Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай. У заходніх губернях (Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай) выбарнае земства не ўводзілася з-за значнай перавагі сярод выбаршчыкаў католікаў, якіх адносілі да палякаў.

**Вынікі:** рост буржуазнай уласнасці (пераважная большасць зямель пераходзіла ў рукі заможных сялян-прадпрымальнікаў); рост сельска-гаспадарчай вытворчасці: пашырэнне шматпольных севазваротаў, выкарыстанне сельскагаспадарчых машын, павышэнне ўраджайнасці; паглыбленне спецыялізацыі на малочнай жывёлагадоўлі і вінакурэнні; уцягванне заможных гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны.

У сваёй палітычнай частцы рэформа паскорыла раскол вёскі і стварэнне слоя сельскай буржуазіі з ліку заможных сялян, забяспечыла падтрымку царскаму ўраду і на пэўны час прадухіліла сацыяльныя ўзрушэнні, «прытупіўшы» вастрыню аграрнага пытання.

## ДА ВЕДАМА АЎТАРАЎ!

Даводзім да вашага ведама, што ў сувязі са зменамі ў падатковым заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, дасылаючы свае матэрыялы ў выдавецтва, неабходна поўнасцю пазначаць грамадзянства, адрас рэгістрацыі, пашпартныя даныя (калі і кім выдадзены пашпарт, нумар пашпарта, ідэнтыфікацыйны нумар), а таксама кантактныя тэлефоны. У іншым выпадку артыкулы да разгляду прымацца не будуць.



gisdapamoga.bspu.by